Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 3. Варыянт 2**

**Білет 3. Практычнае заданне**. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь

**Заданне склала:**настаўнік вышэйшай катэгорыі Андрэева А. А., ДУА "Гімназія №1 г. Віцебска імя Ж. І. Алфёрава"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы адкажыце на пытанні:**

1. Якія асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі нашай краіны?
2. Якія напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца прыярытэтнымі?
3. Вызначыце перавагі і недахопы геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь.
4. Якім чынам геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь абумовіла шматвектарны характар яе знешняй палітыкі?

**Крыніца I**

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**

**Артыкул 8.**

Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.

Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.

Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

**Артыкул 18**.

«Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў адносінах да іншых дзяржаў».

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца II**

| Эмблема Еўразійскага эканамічнага саюза | Эмблема СНД | Эмблема Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы | Эмблема ААН |
|---|---|---|---|

**Крыніца III**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі